ЛЮДЗІ ДАВЯРАЮЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛАМ 4






ЧЫМ НАС ЗДЗІВІЦЬ «ЛІСТАПАД»? 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. СУБОТА № 205 (30339)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сёння ў краіне больш за 123 тысячы шматдзетных сем'яў. Самая вялікая колькасць — у Брэсцкай і Мінскай абласцях: больш за 25 тысяч і амаль 22 тысячы адпаведна. Большасць шматдзетных сем'яў — трохдзетныя (80 працэнтаў). Але ёсць унікальныя сем'і, у якіх выхоўваюцца 10 і больш дзяцей. Тут зноў у лідарах Брэсцкая вобласць — 16 такіх сем'яў, у Гродзенскай і Мінскай абласцях — па 7. Дарэчы, самая вялікая шматдзетная сям'я (у краіне такая пакуль адна) выхоўвае 15 дзяцей — у Мінскай вобласці».*

# Надзейная апора і абярэг сям'і

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з асаблівым сямейным святам — Днём бацькі.

У ім цесна пераплятаюцца высакароднасць мужчынскага характару і святасць бацькоўскага абавязку. Гэтае духоўнае адзінства, напоўненае любоўю бацькоўскага сэрца, стагоддзямі з'яўляецца надзейнай апорай і абярэгам дабрабыту моцнай беларускай сям'і.

З імем і адказнай роляй бацькі звязаны шчасце самых родных і блізкіх, іх поспехі і дасягненні, без якіх немагчыма будучыня нашай Радзімы.

Ад нас, мужчын, дзеці і ўнукі пераймаюць галоўныя жыццёвыя мудрасці, вучацца пераадольваць цяжкасці, ісці выбраным шляхам, быць карыснымі грамадству і дзяржаве, любіць і абараняць зямлю продкаў.

Жадаю кожнаму беларускаму мужчыну ў поўнай меры спазнаць і праявіць радасць бацькоўскага клопату і заўсёды берагчы ў сваім сэрцы цеплыню бацькоўскай любові. Няхай ва ўсіх нас для гэтага нават у самых няпростых абставінах хапае сіл і здароўя.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




У сям'і старшага майстра Мінскага завода колавых цягачоў Аляксея ЗАЙЦАВА і яго жонкі Валянціны трое сыноў: Яраслаў, Ягор і Яўген. Тата ахвотна займаецца з хлопцамі спортам. На гэтым фота яны на спартыўным свяце, прымеркаваным да Тыдня бацькоўскай любові, што праходзіла ўчора ў Фізкультурна-спартыўным цэнтры дзяцей і моладзі Заводскага раёна Мінска. Праўда, трапілі туды з бацькам толькі 11-гадовы Яраслаў і шасцігадовы Яўген, а Ягор, якому дзевяць, вучыцца ў другую змену...

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Эканоміка Беларусі па выніках дзевяці месяцаў захоўвае тэмп росту, вышэйшы за прагнозныя і сярэднесусветныя паказчыкі.**
- З пачатку года ў Беларусь уехаў 109 601 грамадзянін Украіны.
- **Каўчэг з часцінкай мошчаў прападобнай Ефрасінні Маскоўскай будзе знаходзіцца ў Спаса-Ефрасіннеўскім мітрапалітным жаночым манастыры да 1 лістапада.**
- На XIII Пецярбургскім міжнародным газавым форуме БелАЗ прадставіў комплексныя рашэнні — 90-тонны кар'ерны самазвал БелАЗ-7558Н на газе з заправачным комплексам расійскай вытворчасці і заключыў пяць пагадненняў аб супрацоўніцтве, якія садзейнічаюць развіццю рынку газаматорнага паліва Саюзнай дзяржавы.

Дзяржаўны інтарэс

## КАРАЛЕВЕ ПАЛЁЎ У НАС ДОБРА

**Беларускія гібрыды кукурузы не саступяць заходнім па прадукцыйнасці, але толькі пры ўмове захавання тэхналогіі іх вырошчвання**



**Сёлета кукурузны год, гавораць навукоўцы. Рэкордная спякота ў жніўні, якая негатыўна паўплывала на ўраджаі іншых культур, кукурузе пайшла толькі на карысць: ураджайнасць яе па краіне — у межах сярэднесусветных паказчыкаў. Звярнуўшы на гэта ўвагу, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас нядаўняй паездкі ў Шклоўскі раён паставіў задачу замяніць імпартныя сарты гэтай культуры яснымі айчыннымі. Аб тым, у якіх кірунках працуюць у Акадэміі навук нашай краіны, ствараючы новыя гібрыды кукурузы, і чаму гэта работа сёння асабліва важная, расказаў першы намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Эрома УРБАН.** СТАР. 7

Дарога да храма

## ЖАМЧУЖЫНЫ КІРАЎШЧЫНЫ

**Як святар разам з райвыканкамам арганізоўвае вольны час дзяцей і аднаўляе гісторыю краю**

**Даведнік «Кіраўшчына праваслаўная» якраз створаны сумеснымі намаганнямі прыхода мясцовага Свята-Пакроўскага храма і раённага Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Ён прапаноўвае некалькі цікавых экскурсійна-паломніцкіх маршрутаў духоўна-гістарычнай накіраванасці і называецца «Жамчужныя ніткі Кіраўшчыны». Настаяцель храма протаіерэй Дзмітрый ПЕРВІЙ прыехаў у Кіраўск роўна 15 гадоў таму. Увесь гэты час яго дзейнасць не абмяжоўваецца службай у храме. Ён дапамагае мясцовай уладзе выхоўваць моладзь, аднаўляць гісторыю багатага на падзеі краю, удзельнічае ў выдавецтве гісторыка-духоўных кніг, адраджае ў вёсачках раёна царкоўнае жыццё.**

### Слова і справа

У чаканні айца Дзмітрыя разгаварылася з прыхаджанкай Таццянай. Чулі б вы, як цудоўна яна спявае царкоўныя песні! У нядзельнай школе і спецыяльна створаным для дзяцей дашкольнага ўзросту клубе «Анёлак» яна працуе педагогам. Робіць сваімі рукамі лялькі і з іх дапамогай праз гульню вучыць малых пазнаваць прыгажосць і складанасць свету, любіць бліжняга, не красці, не крыўдзіць слабых, паважаць сваіх бацькоў. Дзеці гуляюць і хутка засвойваюць інфармацыю. Імправізацыя дапамагае зрабіць працэс пазнавання больш жывым і цікавым. Тэмы на занятках па духоўнасці ўзнімаюцца складаныя. СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

24205

9 771990 763008

Афіцыйна

## Камісія па вяртанні будзе дзейнічаць пастаянна

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 17 кастрычніка падпісаў Указ нумар 397, якім удасканальваецца работа створанай пры Генеральнай пракуратуры камісіі па разглядзе зваротаў грамадзян Рэспублікі Беларусь па пытаннях учынення імі правапарушэнняў. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.**

Дзейнасць камісіі цяпер будзе мець пастаянны характар (раней тэрмін яе работы абмяжоўваўся 31 снежня 2024 года). Пры гэтым камісія надзяляецца правам разглядаць звароты беларускіх грамадзян, якія знаходзяцца як за мяжой, так і на тэрыторыі краіны. Апошнія будуць разглядацца па даручэнні Прэзідэнта.

Па выніках разгляду зваротаў грамадзяне будуць інфармавацца не толькі аб наяўнасці або адсутнасці ў дачыненні да іх адміністрацыйнага працэсу, узбуджанай крымінальнай справы, але таксама і аб правядзенні ў дачыненні да іх адпаведнай праверкі, наяўнасці або адсутнасці падстаў для яе.

## Свайго павінна быць больш

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала парфумерна-касметычную фабрыку «Модум — наша касметыка», паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента. У рамках наведвання Старшыня Савета Рэспублікі сумесна з кіраўніцтвам Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Мінскага гарвыканкама, найбуйнейшых гандлёвых сетак Беларусі абмеркавала пытанні рэалізацыі тавараў айчыннай вытворчасці ў аб'ектах рознічнага гандлю і пералік мер, якія неабходна прыняць для павелічэння долі айчынных тавараў у рознічным тавараабароце

Міжнародны вектар

# АДНОСІНЫ ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ

### Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з паслом Кітая ў Беларусі

**Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла сімвалічнасць таго, што Чжан Вэньчуань, які нядаўна пачаў дыпламатычную місію ў нашай краіне, уручыў даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі ў дзень святкавання 75-годдзя ўтварэння Кітая. Спікер падкрэсліла, што гэта вельмі добры знак і, карыстаючыся выпадкам, павіншавала кітайскі народ са знакавай датай.**

Спікер адзначыла высокі ўзровень палітычных адносін паміж краінамі. Яна нагадала, што ў жніўні, калі праходзіў візіт прэм'ера Дзяржаўнага савета КНР Лі Цяна ў Беларусь, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу — вывесці эканамічнае супрацоўніцтва на ўзровень палітычнага. Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, тавараабарот паміж краінамі складае практычна 8,5 мільярда долараў. «Разам з тым мы павінны вельмі актыўна працаваць, і мы, як парламентарыі, будзем рабіць усё для таго, каб наша супрацоўніцтва развівалася абсалютна па ўсіх кірунках», — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава.

Кажучы аб міжпарламенцкім узаемадзеянні, спікер нагадала аб афіцыйным візіце парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў КНР, які адбыўся ў маі гэтага года. «Мы правялі цудоўныя сустрэчы, абмеркавалі вельмі актуальныя пытанні, якія датычацца нашага супрацоўніцтва, — канкрэтызавала яна. — Паездка была цудоўная, па часе яна была непрацяглая, але, на мой погляд, вельмі эфектыўная».

У прыватнасці, падчас візіту было праведзена першае пасяджэнне Камітэта высокага ўзроўню, дзе абмяркоўваліся найбольш актуальныя пытанні далейшага ўзаемадзеяння. Наступнае пасяджэнне, па словах спікера, у найбліжэйшы час плануецца правесці ў рэжыме анлайн — для таго, каб зверыць



гадзіннікі па тых пытаннях, якія абмяркоўваліся падчас сустрэчы ў Кітаі.

Наталля Качанава падкрэсліла, што Савет Рэспублікі, які з'яўляецца органам тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, зацікаўлены ва ўстанаўленні адносін паміж рэгіёнамі дзвюх краін. У сувязі з гэтым спікер агучыла прапанову Прэзідэнта Беларусі — праводзіць форумы рэгіёнаў (па аналогіі з тымі, якія на працягу 11 гадоў наша краіна праводзіць з Расійскай Федэрацыяй). У гэтым, як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, бачыцца эфектыўнасць народнай дыпламатыі. «Мы зможам рэалізаваць гэтае мерапрыемства, няма ніякіх сумненняў, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Гэта дасць новы імпульс нашаму супрацоўніцтву».

Спікер таксама выказала ўдзячнасць Кітаю за падтрымку Беларусі пры ўступленні нашай краіны ў ШАС. «Мы заўсёды падзялялі, падзяляем і будзем падзяляць тую палітыку, якую праводзіць Кітай, — дапоўніла яна. — Палітыка нашых краін вельмі падобная. Калі ўнутраная палітыка, то гэта перш за ўсё людзі, паляпшэнне дабрабыту нашых грамадзян. Калі знешняя, то гэта толькі міралюбівая палітыка ў адносінах да іншых краін і захаванне суверэнітэту, незалежнасць кожнай краіны, неўмяшання ва ўнутраныя справы краін. Мы будзем усё рабіць для таго, каб працягнуць гэтае супрацоўніцтва».

Як адзначыў у размове з журналістамі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан ВЭНЬЧУАНЬ,** Кітай і Беларусь — сапраўдныя сябры і надзейныя партнёры. «Упэўнены, што пад кіраўніцтвам нашых лідараў і пры агульных намаганнях нашы двухбаковыя адносіны і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва будзе павышацца пастаянна», — сказаў ён.

Кажучы аб прапанове праводзіць форум рэгіёнаў Беларусі і Кітая, пасол звярнуў увагу, што рэгіянальнае супрацоўніцтва мае вельмі вялікі патэнцыял. «Наша пасольства будзе прыкладаць свае намаганні, каб было яшчэ больш візітаў на ўзроўні рэгіёнаў, каб было больш вынікаў у супрацоўніцтве паміж нашымі рэгіёнамі».

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргея АЛЕЙНІКА,** у ходзе сустрэчы быў пацверджаны намер падтрымліваць карэнныя інтарэсы Беларусі і Кітая. Як адзначыў Сяргей Алейнік, падчас сустрэчы вялікая ўвага была ўдзелена Камітэту высокага ўзроўню, які быў створаны сёлета паміж парламентамі Беларусі і Кітая. «Вызначылі далейшыя мерапрыемствы і крокі па развіцці гэтага камітэта, — канкрэтызаваў сенатар. — Натуральна, камітэт будзе ажыццяўляць маніторынг дамоўленасцяў, дасягнутых на міжурадавым узроўні. Найбліжэйшыя пасяджэнні мы прысвецім менавіта гэтым пытанням».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

Акцыя

# З АДКРЫТЫМ СЭРЦАМ, З АДКРЫТАЙ ДУШОЙ

### У Гомелі праходзіць рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства»

**Дзякуючы шырокай праграме госці горада — удзельнікі марафону наведалі шматлікія цікавыя лакацыі: ад вытворчых цэхаў прадпрыемстваў-флагманаў Гомельшчыны да ўстаноў адукацыі, культуры, навукі.**

### Аб'ядноўваць

«Тысячы гамяльчан з адкрытым сэрцам, з адкрытай душой падключыліся да гэтай акцыі», — так апісаў настрой, які зазнаў Гомель гэтымі днямі, **старшыня Гомельскага гарвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ**.

— Для нас гэта вельмі ганаровая місія, але і адказная, бо мы перажываем за арганізацыю. Органы ўлады, прадпрыемствы, арганізацыі імкнуцца зрабіць усё, каб свята прайшло годна, — падкрэсліў кіраўнік гарвыканкама.

Уладзімір Прывалаў нагадаў пра тры кіты, тры складнікі рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі, якія сфармуляваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

— Гэта нацыянальная культура, таленты Беларусі і прыгажосць славянскай душы. І мы вось гэтыя тры пастулаты не проста будзем назіраць. Уся краіна будзе паказваць свае таленты, прыгажосць славянскай душы, яе культуру. Мы ўдзячны нашаму Прэзідэнту, што зможам узбагаціцца часцінкай нашай нацыянальнай культуры, часцінкай талентаў Беларусі, — зазначыў Уладзімір Прывалаў. — Сярод знакавых мерапрыемстваў марафону, якія садзейнічаюць аб'яднанню, — адкрыццё мурала, што ўвасабляе будучыню Беларусі. З нагоды трыццацігоддзя прэзідэнцтва з'явяцца 30 дрэўцаў. Гэта будзе азначаць, што моладзь Беларусі, моладзь Гомельшчыны, Гомеля — з нашым Прэзідэнтам, і ўся тая палітыка, якая праводзіцца Аляксандрам Рыгоравічам, сёння падтрымана і будзе падтрымлівацца гамяльчанамі.

### Развівацца

«Марафон адзінства» ў горадзе над Сожам прыйшоў у кожны калектыў, кожную арганізацыю, прадпрыемства, грамадскае аб'яднанне. Падключыліся да ўдзелу ў рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі ўстановы адукацыі і культуры. У Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. В. Сухога з нагоды свята адкрылася выстава ўнікальных плакатаў са збору Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Са знакам якасці». Тут можна ацаніць, як сілай карцінкі раней матывавалі людзей на працу. Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт прадставіў выставачны праект Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — «Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 г. — ліпень 1944 г.». У экспазіцыі — фотадакументы, узоры зброі, ваеннай амуніцыі, а таксама ўспаміны выкладчыкаў ВНУ аб сваіх родных, якія ў гады вайны ратавалі параненых на фронце. У ГДУ імя Ф. Скарыны запрашаюць на свае вочы ўбачыць збор унікальных кніжных выданняў, якія ў розны час дарылі Аляксандру Лукашэнку лідары розных краін, грамадскія і культурныя дзеячы. Тут працуе выстава «Кнігі ў дар Прэзідэнту».

### Здзіўляцца

Незлічоная колькасць відэа- і фотакантэнту... Ад удзельнікаў марафону — блогераў і членаў творчых калектываў з іншых абласцей, якія ў пераважнай большасці ўпершыню прыехалі ў Гомель, — гучалі вельмі эмацыянальныя водгукі. Гасцей сустракалі на прадпрыемствах «Гомсельмаш» і «Камінтэрн».

«Галоўнае, каб касцюмчык сядзеў...» — госці флагмана лёгкай прамысловасці Гомельшчыны ААТ «Камінтэрн» пераканаліся, што на прадпрыемстве гэта не проста прыгожае выслоўе, а рабочы прынцып. За год тут адшываецца больш як 300 тысяч вырабаў. Удзельнікі марафону наведалі фірмовую краму прадпрыемства, дзе, не марнуючы часу, прымералі навінкі калекцый. Як падзяліліся падчас экскурсіі і блогеры, і члены творчых калектываў, ім вельмі цікава было знутры ацаніць увесь працэс стварэння касцюма.

— На свае вочы пабачыў, наколькі якасна вырабляюць гэтыя рэчы, — адзначыў Мацвей Швец.

Малады чалавек — настаўнік фізічнай культуры адной са школ Мінска, а па сумяшчальніцтве блогер з амаль 50-тысячнай аўдыторыяй. Дзякуючы ўдзелу ў «Марафоне адзінства» ён змог падзяліцца атмасферай свята, яго цікавымі лакацыямі з жыхарамі самых розных куткоў Беларусі і не толькі.

— Будзе шмат цікавых ролікаў. Пакуль ствараю інтрыгу, падаграваю цікавасць аўдыторыі. Упэўнены, што ўсім спадабаецца, — падзяліўся Мацвей.

На прадпрыемстве «Гомсельмаш» экскурсанты пабачылі не толькі мадэлі камбайнаў, якія выпускаліся амаль паўстагоддзя таму, але і сельгасвалы, што толькі нядаўна сышлі з канвеера. Госці ацанілі сучаснае начынне салонаў, пасядзелі за штурваламі.

*Больш падрабязна чытайце ў найбліжэйшым нумары «Звязды» і на сайце zviazda.by.*

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Ураджай-2024

## ПАРАД ТЭХНІКІ, КОНКУРС КАРАВАЯЎ І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПАДВОРКІ —

### Сёння ў Валожыне пройдуць абласныя «Дажынкі» Міншчыны

**«Дажынкі» ў Валожыне, дзе будуць ушаноўваць перадавікоў жніва 2024 года Мінскай вобласці, стануць маштабным святам для жыхароў раёна і гасцей з розных куткоў краіны, запэўнілі ў прэс-службе Мінскага аблвыканкама.**

З самай раніцы пачнуць сваю работу тэматычныя пляцоўкі, інтэрактыўныя зоны, гандлёвыя рады, гарады майстроў і фотазоны. Таксама наведнікаў чакаюць выстава сельскагаспадарчай тэхнікі. Свае экспазіцыі прадставяць бібліятэкі і музеі Мінскай вобласці ва ўнутраным дворыку аранжарэі Тышкевічаў.

На тэрыторыі каля гарадскога возера ўсе ахвотныя змогуць наведаць падворкі нацыянальнасцяў, якія пражываюць на тэрыторыі Мінскай вобласці. Тут жа будуць працаваць выставы ўстаноў сацыяльнай сферы, грамадскіх арганізацый.

Традыцыйная для свята каравайная зона, выставачныя зоны «Міншчына ўраджайная» і выставы раёнаў Мінскай вобласці «Міншчына пад знакам якасці» будуць размешчаны на плошчы Свабоды.

Тут жа пройдуць урачыстыя цырымоніі: уручэнне дзяржаўных узнагарод найлепшым работнікам аграпрамысловага комплексу Мінскай вобласці і ўзнагароджанне пераможцаў абласнога спаборніцтва па ўборцы ўраджаю 2024 года.

А ўвечары на плошчы распачнецца святочны канцэрт з удзелам творчых калектываў Мінскай вобласці, пасля якога на галоўную сцэну выйдуць артысты беларускай і расійскай эстрады. Завершыцца дзень святочным феерверкам і дыскатэкай, на якой будзе выступаць вядомы кавер-гурт.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю Вячаслава Васільевіча ХАРАНЕКІ, былога генеральнага дырэктара РУП «Нацыянальны аэрапорт «Мінск» і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Узаемны інтарэс

# ДВА Ў АДНЫМ

## У Магілёве аб'ядналі магчымасці двух міжнародных эканамічных форумаў

**Юбілейны XV Міжнародны эканамічны форум «Млын поспеху» і II Міжнародны кааперацыйны форум па імпартазамяшчэнні дзяржаў — членаў ШАС наведалі прадстаўнікі органаў улады, дыпламаты і бізнесмены з 16 рэгіёнаў Расіі, а таксама Кітая, Таджыкістана, Індыі, Ірана і Пакістана. Форум «Млын поспеху» ўжо стаў візіткай Магілёўшчыны і пляцоўкай для сустрэч з надзейнымі сябрамі і новымі партнёрамі, цэнтрам генерацыі міжрэгіянальных сувязяў, праектаў і ініцыятыў.**



Што датычыцца другога форуму, то ён з'яўляецца ўнікальнай падзеяй не толькі для Магілёўскага рэгіёна, але і для краіны ў цэлым. Паўнавартасным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Беларусь стала сёлета ў чэрвені. Мерапрыемства ў Магілёве — яшчэ адна магчымасць умацаваць супрацоўніцтва з краінамі ШАС, павысіць узровень прамысловай кааперацыі і паглыбіць міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне.

— Мы прыцягнулі да гэтага мерапрыемства вельмі аўтарытэтную дзелавую аўдыторыю, — адзначыў падчас выступлення на пленарным пасяджэнні **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Разглядаем гэта як сведчанне росту цікавасці да эканомікі Магілёўскай вобласці. Яна здолела перабудаваць сваю работу ў новых умовах і выйшла на траекторыю ўстойлівага росту. Мінулы год мы завяршылі з тэмпам росту валавога рэгіянальнага прадукту — 101,6 %. А сёлета да гэтай базы расцём з тэмпам 105,8 %. І значную ролю ў гэтым сыграў форум «Млын поспеху».

Сярод перспектыўных кірункаў, у развіцці якіх аблвыканкам гатовы аказаць садзейнічанне — распрацоўка прыродных рэсурсаў і карысных выкапняў накшталт фасфарытаў, торфу, сапрапеляў, трэпелу, а таксама дрэваапрацоўка, АПК, прамысловасць і турызм. Цікавасць уяўляюць унікальныя прыродныя помнікі, такія як «Блакітная крыніца» ў Слаўгарадскім раёне, Чыгірынскае вадасховішча, а таксама гісторыка-культурныя комплексы — Мсціслаў, Бабруйская крэпасць, парк Падніколле ў Магілёве.

— Мы заўсёды адкрыты для дыялогу, сумесных сустрэч па вырашэнні любых пытанняў, — адзначыў Анатоль Ісачанка. — Для гэтага ў нас ёсць усе неабходныя інструменты падтрымкі бізнесу: Свабодная эканамічная зона «Магілёў», Магілёўскае агенцтва рэгіянальнага развіцця, Магілёўскае аддзяленне Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Яны ствараюць спрыяльныя ўмовы і садзейнічаюць развіццю сувязяў дзелавых колаў з замежнымі партнёрамі і інвестарамі. Яшчэ адной унікальнай перавагай Магілёўскай вобласці з'яўляецца паўднёва-ўсходні рэгіён, які ўключае ў сябе сем раёнаў. Дзякуючы ўказу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, тут створаны выключныя льготныя ўмовы.

На сёння Магілёўшчына заключыла каля 60 дакументаў з замежнымі рэгіёнамі, сярод якіх 28 расійскіх. Адна з абласцей, з якой шчыльна працуе Магілёўшчына, — Калінінградская, з якой у 2023 годзе было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. На форум прыбыла вялікая дэлегацыя з гэтага рэгіёна на чале з **губернатарам Аляксеем БЯСПРОЗВАНЫХ.** Беларусь уваходзіць у першую тройку партнёраў, з якімі вобласць узаемадзейнічае.

— Мы збіраемся шчыльна працаваць па ўсіх кірунках — эканамічным, сацыяльным, турыстычным, — адзначыў кіраўнік Калінінградскай вобласці. — Супрацоўніцтва наша развіваецца ва ўсіх важных галінах. У сучасных рэаліях значнымі сталі пытанні транспарціроўкі. Санкцыі забараняюць нам рабіць гэта праз тэрыторыю Літвы, і мы пераарыентаваліся на марскія перавозкі. Бізнес гнутка падстройваецца пад гэтыя ўмовы. Сёння на лініі працуе 28 суднаў, плануецца пашырэнне. Нягледзячы на складаныя ўмовы, у нас рэалізоўваюцца дастаткова перспектыўныя праекты ў сферы высокіх тэхналогій, электратэхнічнай прамысловасці. Пашыраем магчымасці нашага аўтапрама, развіваем цяжкую індустрыю. Як прыклад — у Калінінградскай вобласці працуе найбуйнейшы ў Еўропе завод па вытворчасці крамянёвых пласцін, якія сёння вельмі запатрабаваны. Рэалізоўваем маштабны праект па вытворчасці літый-іонных батарэй. Калінінградская вобласць таксама славіцца сваім аўтапрамам. І планы ў гэтым кірунку таксама вялікія. **Намеснік міністра эканомікі Беларусі Уладзімір НАВУМОВІЧ** назваў магілёўскі форум вельмі перспектыўнай пляцоўкай для стварэння паміж рэгіёнамі краін прамысловай кааперацыі і актыўнага развіцця імпартазамяшчальных праектаў.

— Мы яшчэ з 2000-х гадоў сябруем з Магілёўскай вобласцю, — расказаў **першы намеснік прэфекта Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы Юрый ЗАХАРАЎ.** — Наша прамысловая акруга ў Маскве самая вялікая па плошчы, тут працуе каля 126 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў. І некаторыя з іх — у цеснай кааперацыі не толькі з магілёўскімі вытворцамі, але і ў цэлым з вытворцамі па ўсёй Беларусі. Таму нам вельмі цікавы гэты форум і мы наведваем яго штогод. Для нас заўсёды ёсць вынік. І гэтым разам мы прывезлі ў Магілёў пэўныя прапановы. Калі ёсць эканамічная цікавасць, развіваецца ўсё астатняе.

**Пасол Пакістана ў Беларусі Саджад Хайдэр ХАН** падкрэсліў, што, пашыраючы супрацоўніцтва ва ўсіх галінах, краіны — члены ШАС адкрываюць новыя шляхі для ўстойлівага росту. Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, у якую ўваходзіць каля 40 % насельніцтва свету і на якую прыпадае каля 30 % сусветнага ВУП, — добрая магчымасць для гандлю, інвестыцый і супрацоўніцтва.

Сёлета Пакістан і Беларусь адзначалі 30-гадовую гадавіну дыпламатычных адносін паміж краінамі. За гэтыя гады ўстаноўлены моцныя эканамічныя і культурныя сувязі. І, як адзначыў пасол, адносіны паміж краінамі знаходзяцца на ўзыходзячай траекторыі.

Магілёў і кітайскі горад Сіянь — пабрацімы, сябруюць не першы год. Абодва бакі зацікаўлены ў пашырэнні гандлёвых, эканамічных, турыстычных зносін.

— Вельмі рады быць на гэтым форуме, — адзначыў **выканаўчы віцэ-прэзідэнт Федэрацыі кітайскіх эмігрантаў, галоўны прадстаўнік Сіяньскага камерцыйнага прадстаўніцтва ў Беларусі ЛЕЙ Нін.** — Мы прадстаўляем правінцыю Шансі, у будучыні плануем адкрыць у Магілёве кітайскі рэстаран, пазнаёміць з кітайскай ежай, культурай.

Падчас пленарнага пасяджэння старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка падпісаў двухбаковыя дакументы з губернатарам Калінінградскай вобласці Аляксеем Бяспрозваных (План мерапрыемстваў на 2025—2026 гады па рэалізацыі Пагаднення паміж аблвыканкамам і Урадам Калінінградскай вобласці), старшынёй Асацыяцыі Кітайскіх Кампаній Чжан Чжаа (Мемарандум аб намерах па супрацоўніцтве), заснавальнікам ААТ «Клімавіцкі малочны камбінат» Аляксеем Саўчуком (Пратакол аб рэалізацыі інвестпраекта па вытворчасці сухіх малочных прадуктаў), кіраўніком СЭЗ «Магілёў» Паўлам Марыненкам (аб стварэнні індустрыяльнага парка на пляцоўцы № 4 СЭЗ «Магілёў»).

Шмат цікавага і інавацыйнага было прадстаўлена на выставе экспартна-арыентаваных прадпрыемстваў краін — членаў ШАС, дзе адбылася прэзентацыя рэгіёнаў і прадпрыемстваў. Пасля ўдзельнікі мелі магчымасць прыняць удзел у рабоце секцый і дэталёва абмеркаваць шляхі супрацоўніцтва і праекты ў галіне рэгіянальнай кааперацыі, фінансавай і транспартнай лагістыкі, турызму. Тэмамі для абмеркавання сталі таксама электронны гандаль і фінансавая падтрымка суб'ектаў гаспадарання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

Падрабязнасці

# АНТАРКТЫДА — ГЭТА МЕСЦА СІЛЫ

## Беларускія палярнікі адкрылі завесу тайны сваёй працы

**У чацвер на сустрэчы з удзельнікамі палярных экспедыцый Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асваенне Антарктыды можна параўнаць з палётамі ў космас. І справа нават не толькі ў навуковай важнасці, значнасці для краіны. Космас, Антарктыда — даступныя адзінкам, але цікавыя тысячам людзей.**



Фота БелТА.

Падарунак палярнікаў Прэзідэнту — мінерал узростам каля 4 млрд гадоў.

16-я беларуская антарктычная экспедыцыя працягвалася з лістапада 2023 да чэрвеня 2024 і стала самай працяглай за ўсю гісторыю беларускіх даследаванняў Антарктыды. Правесці сем месяцаў на краі свету, у холадзе, без звыклых рэчаў, а галоўнае — без родных і блізкіх — могуць толькі сапраўдныя героі. Таму журналісты, якія ў чацвер прыехалі ў Палацы Незалежнасці, не маглі не распытаць у іх пра Антарктыду.

**Намеснік Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў і начальнік усіх беларускіх палярных экспедыцый Аляксей ГАЙДАШОЎ** прывёў невялікую гістарычную даведку. Вывучэнне Антарктыды беларусамі пачалося яшчэ ў 1955 годзе ў складзе першай комплекснай антарктычнай экспедыцыі. Дзесяць беларусаў будавалі першую савецкую антарктычную станцыю «Мірны». З 1955 да 1992 года 100 беларусаў розных спецыяльнасцяў удзельнічалі ў дзейнасці савецкіх антарктычных экспедыцый. З 2006 года белы кантынент вывучаюць грамадзяне суверэннай Беларусі.

Удзельнікі 16-й беларускай экспедыцыі зрабілі тое, што здаецца немагчымым, — здзейснілі ўнутрыкантынентальны шматдзённы даследчы паход у нявывучаныя раёны Антарктыды, куды ніколі не ступала нага чалавека. У выніку выйшлі да горнага масіву агульнай плошчай 36 тысяч квадратных кіламетраў, што супастаўна з памерамі Мінскай вобласці. «Гэта задзел для навукі, для даследаванняў на гады наперад. Гэты горны масіў багаты на карысныя выкапні. Да 2049 года дзейнічае забарона ў Антарктыдзе на прамысловую разведку і здабычу карысных выкапняў. Але што будзе пасля 2049 года, ніхто не ведае. Гэта задзел на будучыню, гэта задача, якая ставіцца дзяржавай, — не толькі глядзець пад ногі сёння, але і глядзець на будучыню, рабіць задзел для будучых пакаленняў», — адзначыў Аляксей Гайдашоў. Ён заўважыў, што запасы карысных выкапняў, неабходных чалавецтву, калі не вычарпаны, то блізкія да той чырвонай рысы, калі будуць вычарпаны. Таму Антарктыда разглядаецца як некранутыя велізарныя масіў гэтых запасаў. Не для адной краіны, а для ўсяго чалавецтва. Але ёсць і іншы момант, не менш важны і карысны для чалавецтва. «Антарктыда — гэта сусветны запаведнік, і ўся наша праца накіравана на тое, каб захаваць гэты некранутыя велізарны рэгіён у першародным выглядзе, мы гэтым і займаемся», — падкрэсліў Аляксей Гайдашоў. Дарэчы, за яго плячыма — 15 палярных экспедыцый. Неверагодна!

**Аляксей ЗАХВАТАЎ, інжынер,** а сёння яшчэ і камандзір паветранага судна, у Антарктыдзе ездзіў чатыры разы. Ён — адзін з тых, хто наладжваў беларускую станцыю і адказваў за яе жыццезабеспячэнне, работу тэхнікі, падрыхтоўку ўзлётна-пасадачнай паласы. Можна толькі ўявіць узровень адказнасці. «Як правіла, пасля першай экспедыцыі кажуць, што больш ніколі туды не паедуць. Але праходзіць час — і зноў цягне туды. І ў мяне так атрымалася з другой, трэцяй, чацвёртай экспедыцыямі. Пакуль я ў рэзерве, але ўсё роўна цягне. Антарктыда — гэта іншае вымярэнне, іншае жыццё, і там зусім інакш адчуваецца ўсё вакол, час ідзе інакш. Для мяне Антарктыда — месца сілы, там я сябе рэалізаваў як спецыяліст, як прафесіянал. Там я разумею, што, калі я нешта не зраблю, — ніхто не зробіць. Гэта вельмі добра матывуе ўвесь час развівацца. Адказнасць на нас там каласальная. У 2015 годзе, калі мы ставілі станцыю, учатырох нам трэба было за 28 гадзін сабраць платформу, падрыхтаваць яе да прыняцця дзяржгрузу (нашых збудаванняў) з верталёта. І гэта была бесперапынная праца, 28 гадзін без сну, вецер 30 метраў за секунду і завіруха, мінусавая тэмпература. Гэта вельмі сур'ёзныя выпрабаванні для чалавека. Ехаў па экстрым, а атрымаў нават больш», — дзеліцца Аляксей. І крыху пра надвор'е. У летні перыяд тэмпература паветра ў Антарктыдзе каля нуля, здараецца, мінус 10—15 градусаў. Але самае страшнае, па словах палярнікаў, — вецер. А самым складаным Аляксей Захватаў называе барацьбу са сваімі эмоцыямі, асабліва ў навічкоў: «Раней была праблема з сувяззю, цяпер у нас ужо ёсць добры інтэрнэт і ўжо працэй, можна падтрымліваць камунікацыю з рознымі. І плюс усе ўдзельнікі экспедыцыі тут праходзяць псіхалагічныя адборы, рыхтуюцца да гэтага. Таму мы гатовы да ўсяго. Але экспедыцыя працягваецца шэсць — сем месяцаў, можа нават да васьмі даходзіць. Забеспячэнне выдатнае, ежы, рэчаў, абсталявання — усяго хапае. Але жывых адносін з блізкімі, іх абдымкаў не хапае больш за ўсё».

Асноўнай паспяховай экспедыцыі **ўрач-хірург Леанід НІКІЦЮК** называе здароўе каманды. Менавіта за яго ён адказвае. Па досведзе трох экспедыцый, галоўным сродкам для падтрымання здароўя ў Антарктыдзе ён называе добры настрой. «Дробязяў не бывае: важна ўсё: настрой, адзенне, ежа, лекі. Калі ўсё правільна сабрана, тады і баяцца няма чаго. І даю вам гарантыю, што настрой у нас заўсёды добры — а гэта самае галоўнае. Тым больш у нас цяпер ёсць магчымасці мець сувязь з роднымі», — адзначае ён. Цікавы факт: у палярнікаў павінны быць ідэальна здаровыя зубы, каб, крый божа, зубны боль не прачнуўся падчас экспедыцыі. А за савецкім часам перад экспедыцыяй яе ўдзельнікам выдалялі яшчэ і апендыцыт, каб ён там не запаліўся. Сёння ад гэтай меры адышлі. Дарэчы, урач у экспедыцыі ўсяго адзін. Таму, як адзначае Леанід Нікіцюк, хірург па спецыяльнасці, валодаць ён павінен усімі навыкамі і быць гатовы аказаць дапамогу ў любой сітуацыі. «Даводзілася і зубы выдаляць у Антарктыдзе, і розныя траўмы лячыць. І душэўна лячылі. Толькі роды не прымалі, бо жанчын у экспедыцыі няма», — расказвае ён.

Сваю працу на белым кантыненце палярнікі не рамантызуюць. Шчыра адзначаюць: холадна, цяжка, напружана. Але дадаюць, што гэта непараўнальна ні з чым. І зноў вяртаюцца ў гэты суровы край. І як такое разумець?

А, можа, і не трэба тое разумець? Няхай гэта будзе даступна толькі такім смелым і гераічным людзям, сапраўдным мужчынам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# БЯСПЕКА — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

## Якія задачы стаяць перад супрацоўнікамі сталічнага Дэпартамента аховы

**Супрацоўнікі Дэпартамента аховы, як правіла, першымі прыбываюць на месца здарэння. Іх мабільнасці і высокай тэхнічнай абсталяванасці, што дазваляе выконваць задачы больш эфектыўна, можна толькі пазайздросціць. Людзі давяраюць прафесіяналам ахову сваёй маёмасці, а кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый звяртаюцца да міліцыянераў не толькі з мэтай забеспячэння бяспекі, але і падтрымання калектыўнай дысцыпліны.**

Толькі ў сталіцы для забеспячэння аховы аб'ектаў і жылых дамоў (пакояў) фізічных асоб штосутачна выстаўляецца больш як 1300 пастоў міліцыі і вартаўнічай аховы. Пад аховай знаходзіцца звыш 59 тысяч аб'ектаў і жылых памяшканняў грамадзян. Супрацоўнікі Дэпартамента аховы імгненна рэагуюць на паведамленні аператыўна-дзяжурных службаў органаў унутраных спраў, спрацоўку ручных сістэм трывожнай сігналізацыі. Па гарачых слядах раскрываюцца тысячы злачынстваў і правапарушэнняў.

У чым асаблівасці ахоўнай службы ў сталічных вартавых правапарадку, якія распрацоўкі дапамагаюць аператыўна рэагаваць на здарэнні і выконваць пастаўленыя задачы, а таксама чаму трывожная кнопка карыстаецца попытам у пажылых грамадзян, даведаліся ў **начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС палкоўніка міліцыі Дзмітрыя ВАСКОЎСКАГА.**

***— Дзмітрый Мікалаевіч, Мінск — найбуйнейшы горад краіны, дзе засяроджваецца вялікая колькасць людзей. Якія асаблівасці па забеспячэнні ахоўнай дзейнасці ў сталіцы?***

— У супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія служаць у сталіцы, сапраўды больш задач. І здарэнняў тут адбываецца больш. Насельніцтва ў Мінску шмат, нямала і прыезджых. Некаторыя спецыяльна наведваюць сталіцу, каб здзейсніць правапарушэнні. Напрыклад, набіраюць у краме адзення на вялікія сумы і спрабуюць, не аплаціўшы, вынесці. Іх у тым ліку затрымліваюць нашы супрацоўнікі. Мы ў асноўным рэагуем на трывожныя кнопкі, якія ўстаноўлены ў гандлёвых аб'ектах. У цэлым, наша служба не адрозніваецца ад службы ў рэгіёнах. Мы выконваем адны і тыя ж задачы. Наша служба была створана для аховы асабліва важных аб'ектаў, аб'ектаў крытычна істотнай інфраструктуры, забеспячэння бяспекі ў банкаўскай сферы. Гэтыя задачы працягваем выконваць.

***— Немагчыма сёння ўявіць без аховы і школы. Ці прызвычаіліся настаўнікі, а самае галоўнае, дзеці і іх бацькі да выканання пэўных правілаў, якія перш за ўсё падрыхтаваны бяспекай?***

— Пад фізічную ахову Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы прыняты ўсе школы ў горадзе Мінску і шэраг сярэдніх навучальных устаноў у Мінскім раёне. У абавязковым парадку ў іх устаноўлены трывожныя кнопкі. У першую чаргу гэта было выклікана негатыўнымі выпадкамі ў школах Расійскай Федэрацыі, дзе адбываліся ўзброеныя напады на вучняў і настаўнікаў. Па дамоўленасці з Міністэрствам адукацыі было прынята рашэнне, што ва ўсіх сярэдніх навучальных установах краіны будуць устаноўлены фізічныя пасты аховы. Але мы не спыняемся толькі на забеспячэнні школ вартавымі. У нашы абавязкі ўваходзіць і абслугоўванне СКУДаў (электронных устройстваў для пропуску грамадзян), вядзём улік чыпаў, картак. Гэтая работа ажыццяўляецца ўжо на працягу чатырох гадоў. Нашы людзі прызвычаіліся. Хаця па першым часе бацькі скардзіліся на тое, што іх не пускаюць у школу, не даюць пераапрануць дзіця. Цяпер разумеюць, што бяспека — перш за ўсё.

***— Менавіта з гэтым, напэўна, звязаны і павышаны попыт на вашы паслугі з боку кіраўніцтва прадпрыемстваў і арганізацый?***

— Сапраўды, прадпрымальнікі, кіраўнікі больш актыўна перадаюць пад нашу ахову свае аб'екты. Па-першае, нам давяраюць. Па-другое, мы пашыраем спектр паслуг.



Дэпартамент аховы арганізоўвае на вытворчасці або ў арганізацыі цэлы комплекс мерапрыемстваў. Ім не трэба весці на прадпрыемстве ахову працы, апранаць супрацоўнікаў вартавой аховы або кантралёраў. Мы бяром гэтую функцыю на сябе ад пачатку да канца. І функцыю кантролю ў тым ліку. Устанаўліваем электронныя тэхнічныя сродкі, ажыццяўляем фізічную ахову. Гэта задавальняе сёння кіраўнікоў, таму яны гатовы свае аб'екты перадаваць нам.

***— А ці ёсць альтэрнатыва?***

— Мы поўнасцю забяспечваем ліцэнзаванне ўсіх відаў дзейнасці, даём прадпрыемствам дазвол на ахоўную дзейнасць. Правяраем іх, кантралюем, аказваем увесь спектр паслуг. Такое рашэнне было прынята кіраўніком дзяржавы, і яно апраўдана. Калі казаць аб чопах, якія б мы сюды запусцілі, то парадку было б менш.

***— Неўзабаве пад вашым кантролем апынецца і мінскі метрапалітэн?***

— Што датычыцца метро, мы бяром яго на кантроль з пункту гледжання тэхнічных сродкаў. Ні ў якім разе не прэтэндуем на тое, каб замяніць супрацоўнікаў метрапалітэна. Там арганізавана належная ахова, якая выконвае розныя функцыі: і ахова, і догляд, і прапускны рэжым, і абілечванне. Мы ж бяром на сябе функцыю абароны. У тым выпадку, калі супрацоўнікам метро спатрэбіцца дапамога міліцыянераў, яны націснуць трывожную кнопку, і нарад аператыўна прыбудзе на месца. Станцыя метро, як правіла, прадугледжвае 12 выхадаў. На якім з іх неабходна будзе затрымаць правапарушальніка або злачынцу — пытанне. Рэспубліканская сістэма відэаманіторынгу грамадскай бяспекі, якой мы карыстаемся, дазволіць нам адправіць нарад канкрэтна туды, дзе было здзейснена правапарушэнне або злачынства.

***— Супрацоўнікі Дэпартамента аховы, як правіла, першымі прыбываюць на месца здарэння. З чым гэта звязана?***

— У першую чаргу з тым, што ў нас ёсць свая зона адказнасці, маршрут. Акрамя таго, мы вельмі мабільныя. Нашых атрадаў заступае на дзяжурства больш, чым у іншых сілавых ведамствах. Разумеючы, што атрад аховы знаходзіцца на канкрэтным маршруце, дзяжурны па РУУС будзе адпраўляць нас туды першымі. Прыбываем на шматлікага роду паведамленні: і на сямейныя скандалы, і на выяўленне безгаспадарчых рэчаў, і проста на дапамогу людзям.

***— Што дазваляе быць мабільнымі?***

— Наш аўтапарк поўнасцю абноўлены. У большасці набываем аўтамабілі айчыннай вытворчасці, якія вельмі добрай якасці. Для выканання службова-баявых задач нам гэтага дастаткова. Новыя аўтамабілі, на якіх перамяшчаюцца супрацоўнікі, дазваляюць ім быць мабільнымі і якасна выконваць пастаўленыя задачы. Гэта і дысцыплінуе: каб атрымаць новую машыну, кіроўца павінен адпавядаць пэўным патрабаванням.

***— У сучасных умовах кватэрныя крадзяжы — гэта ўжо рэдкасць. Ці не звязана гэта з масавым выкарыстаннем паслуг Дэпартамента аховы ўладальнікамі прыватнай уласнасці?***

— Тое, што колькасць кватэрных крадзяжоў скарацілася, — заслуга ўсёй міліцыі. Вялікі ўклад у гэтую работу ўносіць і Дэпартамент аховы. Мы вельмі хутка рэагуем на ўсе заявы грамадзян. Вядома, гэта істотна зніжае ўзровень злачыннасці. У нас шмат выпадкаў, калі грамадзяне, якія карыстаюцца паслугамі Дэпартамента аховы, чып прыкладваюць, а зачыніць кватэру забываюць. Устанаўліваючы трывожную кнопку, грамадзяне не толькі страхуюць сябе ад крадзяжу. Яе можна націскаць і ў выпадку любых супрацьпраўных замахаў. А колькі трывожная кнопка ратуе жыццяў! Пажылым, хворым людзям часам прасцей націснуць яе, чым выклікаць хуткую дапамогу. Калі дзякуючы трывожнай кнопцы будзе захавана хоць адно жыццё, гэта дарагога варта.

***— Пад вашай аховай знаходзяцца і многія адміністрацыйныя аб'екты. Спектр задач, якія вы вырашаеце, каласальны. Ці хапае на гэта кадравых рэсурсаў?***

— У Дэпартаменце аховы створаны ўсе ўмовы для таго, каб малады супрацоўнік, які прыйшоў пасля заканчэння ўстановы адукацыі або адслужыў у арміі, прынёсу карысць сабе, дзяржаве, развіваўся. У нас добрая спартыўная база ва ўсіх падраздзяленнях. У аддзеле Кастрычніцкага раёна створана спартбаза такога ўзроўню, што можна праводзіць любыя спаборніцтвы. Людзей, якія прыходзяць у Дэпартамент аховы, мы атачаем клопатам. Вядома, і ад іх патрабуем, каб, выконваючы тыя ці іншыя задачы, яны таксама адпавядалі нашым патрабаванням. Ёсць шмат прыкладаў, калі прадстаўнікі міністэрстваў пішуць на маё імя лісты аб тым, што той ці іншы супрацоўнік варты заахвочвання, павышэння па службе. Мы ім давяраем, бо кіраўнікі сутыкаюцца з нашымі супрацоўнікамі кожны дзень, якія, нягледзячы на хваробу ці пэўныя цяжкасці, выконваюць пастаўленыя задачы. Пэўны некамплект ёсць, але ў першую чаргу ён звязаны з тым, што мы пашыраем спектр паслуг. Аб'ектаў, якія абслугоўваем, становіцца ўсё больш. На закрыццё аднаго паста нам патрабуецца пяць чалавек. Іх трэба навучыць у вучэбным цэнтры. У цэлым моладзь да нас ідзе. Шмат робім для таго, каб пра нас ведалі і чулі.

***— Дэпартамент аховы развіваецца ў нагу з сучаснымі тэхналогіямі. Наколькі тэхнічныя навінкі дапамагаюць у вашай дзейнасці?***

— Без іх увогуле складана ўявіць нашу службу. Вельмі дапамагае Рэспубліканская сістэма маніторынгу грамадскай бяспекі, якая ўстаноўлена ва ўсіх дзяжурных частках, аддзелах. Устанаўліваем на аб'ектах інавацыйнае відэаназіранне, перыметральную сігналізацыю. Перакінуць нейкі прадмет праз плот незаўважна не атрымаецца: праграма паказвае, што на зямлі з'явілася пэўная перашкода, якой не было некалькі хвілін таму, і выдае сігнал трывогі. Мы прапаноўваем гэтую сістэму кіраўнікам устаноў, якія знаходзяцца пад аховай, разам з сістэмай відэаназірання з магчымасцю кантролю менавіта нашага супрацоўніка, якому неабавязкова знаходзіцца на аб'екце, каб валодаць абстаноўкай. Ён можа несці службу ў дзяжурнай часці, кантраляваць месца, якое ахоўваецца, і пры неабходнасці накіроўваць туды нарад групы затрымання. Актыўна тэсціруем і прымяняем у сваёй службовай дзейнасці аўтаматычную сістэму адкрыцця шлагбаумаў. Пры дапамозе пульта кіравання дзяжурны можа адчыніць любы шлагбаум у горадзе. Гэта дазваляе нам максімальна хутка прыбыць да месца здарэння і аказаць дапамогу тым, хто ў гэтым мае патрэбу. Прапаноўваем устройства кантролю персаналу. Раз у гадзіну чалавек, які, напрыклад, з'яўляецца вартаўніком на аб'екце, павінен адзначыцца. Калі гэтага не адбылося, на месца прыязджае група затрымання. Безумоўна, гэта дысцыплінуе, нямала выяўляем парушэнняў. Шмат каму гэтая сістэма выратавала жыццё. Толькі на маёй памяці тры выпадкі. У адміністрацыйным будынку вартавы страціў прытомнасць. Не атрымаўшы адпаведнага сігналу ад гэтага вартавога, нарад прыбыў на месца. Высветлілася, што ў чалавека здарыўся інсульт. Выклікалі хуткую дапамогу — чалавеку ўдалося захаваць жыццё. Сістэма працуе і дае станоўчы эфект, хаця каштуе не даражэй, чым звычайная трывожная кнопка.

***— Гэта ўсё — айчынныя распрацоўкі?***

— Так, усё наша. У Дэпартаменце аховы створаны спецыяльны аддзел па інавацыйным укараненні дадзеных сродкаў. Уся краіна працуе над гэтым. Самае новае — датчыкі працёку вады. Устанаўліваем аўтаматычнае ўстройства на краны, спецыяльныя датчыкі — на падлогу. У выпадку, калі вада трапіла на датчык, што сведчыць аб падтапленні, дыстанцыйна перакрываецца вада ў кране. Аналагічна сістэма працуе і з газам, калі адбываецца ўцечка. Паслуга запатрабавана ў людзей, якія маюць раз'язны характар работы. Гэта таксама распрацоўка Дэпартамента аховы. Безумоўна, падобныя захады аблегчылі людзям жыццё, а нам — задачы. Тое, што народ зацікаўлены ў гэтым, дае стымул для далейшага развіцця. Мы разумеем, што патрэбны грамадзянам, таму рухаемся наперад. Адзін з прыярытэтаў — знізіць чалавечы фактар у рабоце. Нагрузкі, асабліва ў начны час, на супрацоўнікаў Дэпартамента аховы каласальныя. Таму актыўна ўкараняем тэхнічныя сродкі аховы.

***— Што ў перспектыве?***

— Наперадзе — выбары. Мы прымаем самы актыўны ўдзел у забеспячэнні бяспекі грамадзян падчас гэтага важнага палітычнага мерапрыемства. Большасць выбарчых участкаў размесціцца ў школах, якія знаходзяцца пад нашай аховай. Гэтую ахову мы ўзмоцнім, установім дадатковыя тэхнічныя сродкі, абсталюем трывожнымі кнопкамі ўсе выбарчыя ўчасткі. Наша задача — гарантаваць грамадзянам бяспеку. Гэта самае галоўнае.




**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС.**

Тонкасці прафесіі

# ШЭРЛАК ХОЛМС НА АБЦАСАХ

## Найлепшы сышчык краіны — пра шлях да мары, прафесійную загартоўку і жаданне дапамагаць людзям

**Напэўна, сёння складана знайсці нежаночую прафесію. Сучасным жанчынам усё па сілах: яны і ў арміі служаць, і ў космас лятаюць. А яшчэ кіруюць вялікагрузамі, разбіраюцца ў атамнай энергетыцы і, вядома, ловяць злачынцаў. Іх цярплівасці, настойлівасці і спрытнасці нярэдка могуць пазайздросціць калегі-мужчыны. У гэтым давялося пераканацца падчас рэспубліканскага агляду-конкурсу сярод сышчыкаў Міністэрства ўнутраных спраў, у якім перамагла Кацярына СТАНКЕВІЧ. Старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку Мінскага раённага ўпраўлення ўнутраных спраў не толькі паказала найлепшыя вынікі падчас конкурсных этапаў, апярэдзіўшы вопытных «шэрлакаў холмсаў», але і яшчэ раз пацвердзіла, што і ў такой складанай, рызыкоўнай службе без жанчын не абысціся.**



### СІЛА ХАРАКТАРУ І МАРА ДЗЯЦІНСТВА

Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з Кацярынай і даведаліся, адкуль у гэтай маладой прыгожай дзяўчыны столькі ўнутранай сілы і жадання дапамагаць людзям. Адразу пацікавіліся, як падчас конкурсных выпрабаванняў удалося абагнаць калег, якія і фізічна мацнейшыя, і ў прафесіі значна больш часу.

Як расказала супрацоўнік органаў унутраных спраў, каб трапіць на рэспубліканскі ўзровень, найперш трэба было прайсці адбор у сваім РУУС, потым пазмагацца за першынство на абласным этапе. Ацэньваліся веданне нарматыўна-прававых актаў, фізічная, агнявая і тактыка-спецыяльная падрыхтоўка, паказчыкі ў службовай дзейнасці. Так, будучы ў тройцы найлепшых, маёр міліцыі трапіла на рэспубліканскі агляд-конкурс. У выніку за першынство змагаліся дзве дзяўчыны і 19 мужчын.

«Калі імкнуцца дасягнуць пастаўленай мэты, прыкладаць для гэтага ўсе намаганні, то і ў крымінальным вышуку жанчыне нескладана сябе рэалізаваць», — лічыць Кацярына Станкевіч.

Для яе не існуе невыканальных задач. Калі старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку ставіць сабе мэту, то абавязкова да яе ідзе. Нават тады, калі не ўсё атрымліваецца з першага разу. Летась Кацярына таксама ўдзельнічала ў ведамасным аглядзе-конкурсе, але заняла другое месца. Спыняцца за паўкроку да перамогі — гэта не ў характары дзяўчыны, а таму яна вырашыла паспрабаваць свае сілы і веды сёлета.

Мэтанакіраванасць і ўпартасць у Кацярыны Станкевіч — з дзяцінства. У яе не атрымліваецца нешта рабіць на паўсілы. Толькі да канца, толькі на «выдатна» — менавіта так і вучылася ў школе.

Будучы міліцыянер нарадзілася ў Карэліцкім раёне ў аграгарадку Жухавічы. У сям'і ніхто пагонаў не насіў. Бацька ў свой час праходзіў тэрміновую службу ва ўнутраных войсках і расказваў, што марыў застацца ў міліцыі, але па аб'ектыўных прычынах не атрымалася. Затое вельмі ганарыўся, калі яго мару ўвасобіла дачка.

«Жаданне служыць у міліцыі з'явілася ў раннім узросце, — расказвае Кацярына. — Мне вельмі ўласціва пачуццё справядлівасці, а таму марыла абараняць правы грамадзян, дзяржавы. Вядома, любіла глядзець фільмы, галоўнымі героямі ў якіх былі супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Чытала раённую газету, калекцыяніравала публікацыі пра міліцыянераў. А калі да нас у школу з прафілактычнымі гутаркамі прыходзілі супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх, Дзяржаўтаінспекцыі, садзілася ў першым радзе і задавала шмат пытанняў. Мне было вельмі цікава».

У сёмым класе дзяўчына дакладна ведала, што будзе паступаць на факультэт міліцыі Акадэміі МУС на спецыяльнасць «Аператыўна-вышуковая дзейнасць». Так і атрымалася. Нягледзячы на тое, што прафесійныя дарогі для выдатніцы былі ўсюды адкрытыя, яна не памяняла свайго рашэння. Сям'я выбар дачкі — звязаць свой лёс з міліцэйскай службай — падтрымала. Фізічная падрыхтоўка была на належным узроўні (Кацярына рэгулярна ўдзельнічала ў школьных спаборніцтвах), заставалася здаць цэнтралізаванае тэсціраванне. І з гэтым паспяхова справілася.

### СЯРОД КУРСАНЦКАЙ СЯМ'І І НАСТАЎНІКАЎ-ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Конкурс у Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў заўсёды высокі. Не быў выключэннем і той год, калі паступала Кацярына Станкевіч. Конкурс для дзяўчат — 12 чалавек на месца. Упартасць і сіла волі дапамаглі трапіць Кацярыне ў запаветную сямёрку (менавіта столькі дзяўчат набіралі на курс) і заняць сваё месца ў вялікай курсанцкай сям'і.

**У Мінскае РУУС Кацярына Станкевіч перавялася ў 2019 годзе і стала першай дзяўчынай у крымінальным блоку падраздзялення. Як яна сама прызнаецца, калегі спачатку прыглядаліся, а потым сталі давяраць дзяўчыне адказныя задачы.**

«Шчаслівая збіралася на курс маладога байца, — згадвае яна. — Не шкадавала, што лета працягваецца і можна было б яшчэ месяц адпачыць. Адаптацыя прайшла хутка. У мяне ёсць старэйшы брат, таму мужчынскі калектыў мяне ніколі не палохаў».

Акадэмію МУС ураджэнка Карэліцкага раёна скончыла з адзнакай. Па размеркаванні трапіла ў Баранавіцкі гарадскі аддзел унутраных спраў. Там, у аддзеле крымінальнага вышуку, максімальна акунулася ў прафесію. Маёр міліцыі прызнаецца: ёй пашанцавала трапіць у калектыў прафесіяналаў, якія не шкадавалі яе, як гэта часта бывае ў адносінах да жанчын, а ставіліся як да роўнай — бралі з сабой на месцы злачынстваў, даручалі вядзенне адказных спраў, адпраўлялі на рызыкоўныя заданні. Кацярына з цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінае сваіх баранавіцкіх калег, якія яе шмат чаму навучылі, заклалі любоў да прафесіі.

«Трапіла ў аддзел, які курыраваў лінію рабаванняў і разбояў, — расказвае супрацоўнік органаў унутраных спраў. — Адразу сутыкнулася з сур'ёзнымі злачынствамі: забойствамі, цялеснымі пашкоджаннямі... Мне не даводзілася назіраць за ўсім гэтым збоку, пашчасціла знаходзіцца ў эпіцэнтры падзей. Мой начальнік Генадзь Генадзьевіч Валуй браў мяне з сабой на ўсе здарэнні, за што я яму вельмі ўдзячная. Убачыла, што я баявая і адседжвацца за папяровай работай — не ў маім характары».

### СЛУЖБОВАЯ ЗАГАРТОЎКА

Затым Кацярыну перавялі ў аддзяленне вышуковай работы. І там сумаваць не даводзілася. Дагэтуль у памяці здарэнне, якое ў Баранавічах набыло грамадскі рэзананс.

«Жанчына заявіла аб тым, што ў яе знік былы муж — грамадзянін ЗША, Саламон Ясман, — успамінае абставіны злачынства маёр міліцыі. — Яна чарговы раз прыйшла наведаць яго па месцы жыхарства, аднак мужчыны ў кватэры не было, хаця ён быў пенсіянерам і рэдка кудысьці надоўга выходзіў. Выявіўшы адсутнасць некаторых прадметаў інтэр'ера і рэчаў, жанчына зразумела, што нешта адбылося, таму звярнулася ў міліцыю».

Пасля прыбыцця на месца здарэння супрацоўнікі крымінальнага вышуку выявілі не да канца замытыя плямы крыві, у вадасцёку ў ванным пакоі — тлушчавыя астанкі. Стала відавочным: з гаспадаром кватэры здарылася непрыемнасць. Сышчыкі ўзяліся ўстанаўліваць кола сувязяў пацярпелага. Гэта было няпроста: былая жонка не ведала, з кім яе экс-муж меў зносіны, а таму дапамагчы не магла.

«У раёне, дзе пражываў грамадзянін ЗША, мы пераглядалі запісы камер відэаназірання: з кім ён прыходзіў у гандлёвыя аб'екты, з кім сыходзіў, з кім гутарыў на вуліцы — так устанавілі кола сувязяў пацярпелага, — расказвае Кацярына Станкевіч. — Стала вядома, што нейкі грамадзянін падвозіў яго ў краму. Падчас допыту грамадзянін запэўніў, што сустракаўся з Саламонам Ясманам месяц таму, але камеры відэаназірання сведчылі аб іншым. Неадназначнасць у паказаннях нас насцярожыла, і мы выклікалі падазраванага на паўторны допыт, які праводзілі з выкарыстаннем паліграфа. Вельмі доўга не было ніякіх вынікаў. Ды і нішто не сведчыла аб тым, што гэта злачынец: чалавек не меў судзімасці, займаўся вырабам мэблі, асаблівай увагі да сябе не прыцягваў. У выніку работы каманды прафесіяналаў падазраваны прызнаўся, што задушыў замежнага грамадзяніна, расчляніў яго, пасля чаго вывез часткі цела на ускраіну горада і закапаў».

Гэтае жорсткае забойства, удзельнікам раскрыцця якога з'яўлялася і Кацярына, загартавала яе яшчэ больш. І калі на пачатку службовай дзейнасці дзяўчына магла эмацыянальна рэагаваць на слёзы блізкіх сваякоў памерлых, на фіксацыю смерці якіх ёй нярэдка даводзілася выязджаць, то пасля рэзананснага злачынства ў Баранавічах Кацярына стала больш стрымана і спакойна ўспрымаць тое, з чым сутыкаецца падчас службы. А па-іншаму ў крымінальным вышуку нельга. «Калі хочаш дасягнуць выніку, трэба хутка і цвяроза рэагаваць на любую сітуацыю, працаваць з халоднай галавой», — перакананая маёр міліцыі.

### ПАЎСЯДЗЁННЫЯ ЗАДАЧЫ І СПОСАБ РАССЛАБЛЕННЯ

У Мінскае РУУС Кацярына Станкевіч перавялася ў 2019 годзе і стала першай дзяўчынай у крымінальным блоку падраздзялення. Як яна сама прызнаецца, калегі спачатку прыглядаліся, а потым сталі давяраць дзяўчыне адказныя задачы. Кацярына займалася раскрыццём злачынстваў у сферы аўтабізнесу, цяпер вядзе лінію пратэснай накіраванасці. У полі зроку міліцыянера знаходзяцца тыя, хто абражае прадстаўнікоў органаў улады ў інтэрнэце, з'яўляецца падпісчыкам экстрэмісцкіх рэсурсаў.

«У віртуальнай прасторы нічога не знікае бясследна, — звяртае ўвагу старшы оперупаўнаважаны. — Немагчыма схавацца пад выдуманым іменем і чужым акаўнтам. Раскрывальнасць гэтага віду супрацьпраўных дзеянняў вельмі высокая — 97 %. Таму лепш сто разоў падумаць, перш чым выказацца ў інтэрнэце ці пакрыўдзіць каго-небудзь».

Кацярына праводзіць прафілактычныя мерапрыемствы з асобамі, якія былі асуджаны за злачынствы пратэснай накіраванасці і асуджанымі да пакаранняў, не звязаных з накіраваннем у папраўчыя ўстановы. «Многія, з кім мне даводзіцца размаўляць, памянялі сваё мерkаванне, прызнаюцца, што паддаліся эмоцыям і натоўпу, не разабраўшыся ў сітуацыі», — заўважае міліцыянер.

**«Калі імкнуцца дасягнуць пастаўленай мэты, прыкладаць для гэтага ўсе намаганні, то і ў крымінальным вышуку жанчыне нескладана сябе рэалізаваць».**

...Нягледзячы на шчыльны ненармаваны службовы графік, напоўнены сутачнымі дзяжурствамі, Кацярына прызнаецца, што паспявае многае. Галоўнае, па яе словах, — жаданне. Найлепшай разгрузкай лічыць прабежку. Пераадолець 10 кіламетраў за 50 хвілін — гэта для маёра міліцыі паўсядзённасць. Спорт — тое, што яе не толькі расслабляе, але і трымае ў тонусе.

«Ніколі не пашкадавала аб сваім выбары: тое, чым даводзіцца займацца, — гэта маё, — кажа Кацярына Станкевіч, адказваючы на пытанне, ці бачыць яна сябе ў іншай сферы дзейнасці. — У крымінальным вышуку жанчына можа працаваць не горш за любога мужчыну. Магчыма, у нас менш фізічнай сілы, але мы больш цярплівыя, дапытлівыя, упартыя на шляху да пастаўленай мэты».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва герaіні публікацыі.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
## СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 80 %

**Организатор аукциона:**
**ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**

**Продавец: КПУП «Хойникский ремонтный завод», г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В.В.**

**Торги состоятся 30 октября 2024 года в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28

Подробный перечень имущества в количестве 32 лотов, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документация, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by в разделе Аукционы-«Очные торги».** Дополнительное размещение на сайте Гомельского областного исполнительного комитета – gomel-region.by в разделе «Экономика /Продажа-аренда», далее – «Извещения о проведении аукционов по продаже иного имущества».

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 21.10.2024 по 28.10.2024 с 9.00 до 16.00.**

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Хойніцкія навіны» от 06.04.2023 г. № 14, в газете «Звязда» от 06.04.2023 г. № 69 (30203).

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по тел.: **8 (033) 634-86-95,** Насонов Николай Владимирович – (правовая информация, запись на осмотр имущества); **8 (029) 835-67-42,** Насонов Владимир Валерьевич.

Контактные данные: **(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89. E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

---

### Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-100753** (наименование: **склад комплектующих;** назначение: **здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)** общей площадью 231,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202Б/21, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001034193 площадью 0,0837 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 45 800,00 | Размер задатка, руб. | 4 580,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «БЭМЗ», 224020, г. Брест, ул. Московская, 202, тел./ф 80162340004. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа – 40901. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 30 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия продажи:** без условий. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 19 ноября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 18 ноября 2024 г. до 17.00**

---

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ООО «Полоцкжилстрой»** (Продавец).

Аукцион состоится **30.10.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

### Лот № 1: Производственный корпус с инв № 250/U-33008, 5382,0 кв. м.

Незавершенное законсервированное капитальное строение.

Назначение – здание, специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий.

Адрес:
**Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Гагарина, 1.**

Земельный участок 243500000004000885, 0,1269 га.

Право аренды. Начальная цена с НДС 20 % – 40,00 руб.

Задаток – 40,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 28.10.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Веста-Борисов»** (арендодатель) проводит открытый аукцион

### по продаже права заключения договора аренды части капитального строения (магазина с инв. № 610/С-30873)

**площадью 810,3 кв. м в г. Борисов, ул. Серебренникова, 20 б, сроком на 3 года.**

Размер ежемесячной арендной платы: 243,09 БАВ.

Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 640400000016000131, площадь 0,4429 га.

Возможные направления использования имущества: для осуществления розничной торговли.

Условия: уборка прилегающей территории.

Начальная цена права заключения договора аренды – **3 597,73 бел. руб.**

Базовая арендная величина составляет 17,76 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

**Задаток – 3 597,73 бел. руб. Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение), а также иными актами законодательства.

Штраф в размере **4 000,00 бел. руб.** оплачивается участниками аукциона в следующих случаях:

победителем (единственным участником) аукциона в случае отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора аренды, внесения платы за право заключения договора аренды;

участниками аукциона, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным в соответствии с частью второй пункта 26 Положения;

победителем в случае отказа от подписания протокола о результатах аукциона.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.04.2022, 31.12.2022, 25.04.2024.

Аукцион состоится **30.10.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2024** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, сайт в сети интернет: www.rlt.by.**
**Телефоны для осмотра: (80177) 74-27-44, (8029) 666-03-61.**

УНН 600012029

---

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности Дзержинского района и принадлежащего **УП «ДЗЕРЖИНСКОЕ ЖКХ»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

Аукцион состоится **04.11.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

### Лот № 1: KIA SORENTO,

кузов (рама) № KNAJC524895884431.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 20 196,00 руб.

### Лот № 2: VOLKSWAGEN TOURAN,

кузов (рама) № WVGZZZ1TZ6W050772.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 15 012,00 руб.

**Место нахождение Лотов №№ 1–2:**
Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, пер. Ленина, 11.

Извещение о проведении открытого аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже недвижимого имущества
## со снижением на 60 %

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00117** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Учреждение образования «Молодечненский торгово-экономический колледж» Белкоопсоюза, 222310, Минская обл., г. Молодечно, пл. Центральная, 1, тел. 8 (0176) 777569.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных электронных торгов: 12 ноября 2024 г. в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 250/С-1833 площадью 2027,9 кв. м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б, 1959 г.п., наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: цокольный этаж. Кап. строение с инв. № 250/С-25204 площадью 54,1 кв. м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б/1, год постройки не установлен, наименование – здание гаража, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Кап. строения находятся на зем. участке с кадастровым № 243500000004000064 площадью 0,1852 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б, целевое назначение – зем. участок для содержания и обслуживания объектов административного назначения и гаража (право постоянного пользования).

**Обременения:** договоры аренды, с условиями которых можно ознакомиться по предварительному согласованию с Продавцом.

**Нач. цена: 867 024,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**

**Задаток: 86 702,40 бел. руб.**

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by» с учетом Рекомендаций по отчуждению имущества организациями потребительской кооперации, утвержденными постановлением Правления Белкоопсоюза 30.08.2019 № 263 с изм. и доп.

Для участия в торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по торгам: **до 16.00 11.11.2024.**

*Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Код категории назначения перевода: для юр. лиц и индивид. предпринимателей – OTHR; для физ. лиц – MP2B (платеж с текущего (расчетного) банковского счета физ. лица) или CASH (платеж наличными в кассе банка). Код назначения платежа – 40901 (перечисление гарантийного взноса).*

**Условия повторных электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов и утверждения протокола эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи. Расходы продавца на проведение независимой оценки составляют 873,83 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Имущество, бывшее в употреблении. Победитель эл. торгов (претендент на покупку) приобретает объект по фактическому состоянию с учетом возможности наличия скрытых дефектов.

С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в эл. торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by – в разделе «недвижимое имущество» – «административные здания и помещения». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Ковшель Зинаида Сергеевна, +375 29 8142660.

---

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**
## «БелЮрОбеспечение» (192821149)
**назначено проведение электронных торгов**

| | |
|---|---|
| Организатор | Торговое открытое акционерное общество «Гродно Культторг» |
| Предмет | Лот № 9.2024.11.00008, комплекс недвижимого имущества в г. Гродно |
| Местонахождение | г. Гродно ул. Соколовского, 20К |
| Начальная стоимость | 812 412,07 бел. руб. с НДС |

Торги будут проведены **05.11.2024 с 9.00 до 18.00** на ЭТП e-auction.by.
Задаток в размере 1 процента от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 04.11.2024.
Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»
## **04 ноября 2024 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи с учетом снижения на 40 %, без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 4 | Автомобиль легковой специальный, VOLKSWAGEN PASSAT, седан, цвет – серебристый металлик, 2006 года выпуска, кузов (рама) № WVWZZZ3CZ7P075125, регистрационный знак 0597 EI-6, инвентарный номер 70316 | 8940,00 | 894,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **04 ноября 2024 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **29.10.2024 г., время: 17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 14.09.2024 и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

# КАРАЛЕВЕ ПАЛЁЎ У НАС ДОБРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Эрома Пятровіч, давайце пачнём з таго, наколькі прыдатныя ў Беларусі кліматычныя ўмовы для вырошчвання такой цеплалюбівай культуры, як кукуруза?***

— Умовы цалкам прымальныя. Пра гэта сведчыць хаця б той факт, што кожны год і стабільна ўраджай кукурузы ў нашай краіне перавышае мільён тон — больш за тое, часам дасягае і каля двух мільёнаў тон зерня. Сёлета пасяўныя плошчы на зерне склалі больш за 297 тыс. га, на сілас — 950 тыс. га. Пры гэтым доля пасеваў кукурузы насеннем айчыннай вытворчасці вырасла з 32 % у 2016 годзе да амаль 60 % у 2023 годзе і наблізілася да нарматыўнага паказчыка, які складае як раз 60 %. Адзначу і яшчэ адзін факт: праз два гады мы плануем выйсці на паказчык у 80 % забеспячэння беларускай сельскагаспадарчай галіны ўласнымі сартамі і гібрыдамі кукурузы, і гэтыя планы цалкам рэальныя. У дадзеным напрамку і працуем.



## ПАЧЫНАЦЬ ПРЫЙШЛОСЯ З НУЛЯ

***— Такім чынам, селекцыю кукурузы ў Беларусі можна лічыць даволі паспяховай?***

— Селекцыя гібрыдаў кукурузы была распачата ў Рэспубліцы Беларусь у сярэдзіне 1990-х гадоў — то-бок, адносна нядаўна. І да магчымасці поспеху беларускіх селекцыянераў у гэтым кірунку спачатку калегі з іншых краін ставіліся з недаверам, паколькі кукуруза — цеплалюбівая культура, а клімат Беларусі далёка не ідэальны для атрымання паўнацэннага насення цеплалюбівых культур, якое адпавядае міжнародным стандартам па пасяўных якасцях. Поўнамаштабны селекцыйны працэс кукурузы быў арганізаваны на поўдні краіны, у Палескім інстытуце раслінаводства, які ўваходзіць у якасці даччынага прадпрыемства ў склад Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве.

Па сутнасці, гэту работу мы пачыналі з нуля. Калі ўспомніць 1960-я гады, тады таксама адбывалася нарастанне пасяўных плошчаў пад кукурузу, то ў Савецкім Саюзе беларускія вучоныя ў асноўным распрацоўвалі тэхналогіі вырошчвання кукурузы, а селекцыяй займаліся ў іншых рэспубліках з больш цёплым кліматам. Так што ўласную селекцыю, паўтаруся, пачынаць прыйшлося ў прамым сэнсе з самага пачатку. На гэтым этапе выкарыстоўвалі ў асноўным малдаўскі матэрыял, часткова расійскага і ўкраінскага. І першыя гібрыды ствараліся на сілас, на зялёную масу. Потым быў напрацаваны наш уласны зыходны матэрыял, і ў 2000 годзе мы пашырылі селекцыйныя праграмы і пачалі ствараць універсальныя гібрыды — на сілас і на зерне, вырашыўшы, што дзяліць іх на спецыялізацыі ў нашых кліматычных умовах нерацыянальна. Хаця цяпер ужо ствараем і спецыяльныя сарты і гібрыды зерневага кірунку. У цэлым, у выніку рэалізацыі мэтавых селекцыйных праграм за 30 гадоў выдзелена, вывучана ў сістэме Дзяржаўнага сортавыпрабавання і ўключана ў дзяржаўны рэестр 15 гібрыдаў кукурузы рознага кірунку выкарыстання і хуткаспеласці.

***— Чаму гэта работа настолькі важная на ўзроўні эканомікі краіны?***

— У апошнія гады пасяўныя плошчы пад кукурузу істотна павялічаны — больш за мільён гектараў па краіне. І ў гэтым ёсць і неабходнасць, і мэтазгоднасць. Справа ў тым, што менавіта гэтая культура аптымальная для збалансавання канцэнтраваных кармоў для буйной рагатай жывёлы. Акрамя таго, кукуруза — найважнейшы дадатак да корму ў птушкагадоўчай галіне, ідэальна паказала сябе і па амінакіслотным складзе, і па іншых складніках у рацыёне свіней. Атрымліваецца, што для Беларусі, дзе сёння актыўна развіваецца жывёлагадоўчая галіна, менавіта кукуруза на бягучы момант — адна з ключавых культур.

## «БЕЛАТРЫКС», «ВІВАЛЕН», «ДАР'ЯН»

***— І ўсё ж аграрыі-практыкі часам аддаюць перавагу замежным сартам і гібрыдам, аргументуючы гэта тым, што кукуруза айчыннай селекцыі саступае па ўраджайнасці імпартнай...***

— Сапраўды, нашым селекцыянерам даводзіцца працаваць у жорсткай канкурэнцыі з буйнымі сусветнымі карпарацыямі і замежнымі селекцыйнымі фірмамі. У Дзяржаўным сортавыпрабаванні прадстаўляюць свае гібрыды кукурузы каля 30 замежных кампаній са стагадовай гісторыяй вядзення селекцыйнага працэсу. Яны маюць сетку даччыных прадпрыемстваў, у іх ёсць магчымасць праводзіць ацэнку і абмен селекцыйнага матэрыялу ў розных экалагічных пунктах. Маюць яны таксама адпаведную колькасць кадравага патэнцыялу і адпаведнае фінансаванне. Але калі ўлічваць той факт, што селекцыйны працэс па стварэнні сорту любой расліны працягваецца ў сярэднім 10—12 гадоў, а селекцыя гібрыдаў кукурузы ў нашай краіне пачыналася практычна з нуля, то поспехі беларускіх селекцыянераў па кукурузе трэба прызнаць дастаткова значнымі. Па выніках выпрабавання за перыяд гэтай работы ў дзяржаўны рэестр уключана пяць гібрыдаў кукурузы селекцыі інстытута: «Вівален 3218» (2022 год), «Вівален 1118» (2022 год), «Дар'ян» (2022 год), «Вівален 3419» (2023 год), «Вівален 3620» (2024 год). Гібрыды з лінейкі «Вівален» — новай фармацыі, з высокімі паказчыкамі адаптыўнасці і прадукцыйнасці, створаныя з выкарыстаннем абсалютна новага зыходнага матэрыялу. Яны забяспечваюць узровень прадукцыйнасці збожжа 140—160 ц/га, зялёнай масы — 240—250 ц/га сухога рэчыва, што адпавядае сусветнаму ўзроўню. Яны ў поўнай меры могуць замяніць гібрыды заходнееўрапейскай селекцыі. Але пры адной умове: скрупулёзнага захавання тэхналогіі апрацоўкі. Важна вытрымліваць тэрміны і тэхналогію сяўбы, выкарыстоўваць якасныя прэпараты для аховы раслін і адпаведныя ўгнаенні на кожным этапе вырошчвання культуры. Калі гэтага не рабіць, страты ўраджаю ў параўнанні з прагнознымі паказчыкамі могуць дасягаць 50 %. Дарэчы, гэта датычыцца любых сучасных інтэнсіўных сартоў і гібрыдаў — і замежнай селекцыі ў тым ліку.

***— Над чым сёння працуюць навукоўцы? На што ў найбольшай ступені звяртаюць увагу пры селекцыі кукурузы?***

— У першую чаргу — на адаптыўнасць, на фактар холадаўстойлівасці. Айчынныя гібрыды і сарты павінны быць устойлівыя да паніжаных тэмператур, таму што сяўба ў паўднёвых рэгіёнах, на Брэстчыне пачынаецца ўжо ў трэцяй дэкадзе красавіка, а часам нават крыху раней. Справа ў тым, што ўвесну ў апошнія гады глеба хутка ссыхае, а каб насенне кукурузы прарасло, зярняткам неабходна набраць 150—200 % вільгаці да ўласнай масы.

Цяпер у сістэме дзяржаўнага сортавыпрабавання праходзяць ацэнку восем гібрыдаў кукурузы селекцыі інстытута, у тым ліку гібрыды новай лінейкі «Белатрыкс» (з высокімі якаснымі паказчыкамі кармавой прадукцыі): «Белатрыкс 2301», «Белатрыкс 2302», «Белатрыкс 2303». Вялікая ўвага — наладжванню прамысловага насенняводства айчынных гібрыдаў у сыравінных зонах беларускіх кукурузакалібровачных заводаў. Штогод вырабляецца больш за 10 тысяч тон кандыцыйнага насення гібрыдаў селекцыі Палескага інстытута раслінаводства, што складае больш за 60 % патрэбы краіны ў насенні гібрыдаў кукурузы ранняспелай і сярэдняранняй груп спеласці. У Палескім інстытуце раслінаводства наладжана арыгінальнае і прамысловае насенняводства новых гібрыдаў «Вівален 118», «Вівален 3218» і «Дар'ян». У 2022—2023 гадах выраблена больш за 50 тон насення бацькоўскіх форм гэтых гібрыдаў, у сыравінных зонах Мазырскага і Івацэвіцкага ККЗ у 2023 годзе выраблена больш за 2,5 тыс. тон гібрыднага насення новых гібрыдаў кукурузы «Вівален 3218» і «Дар'ян». Наладжванне прамысловага насенняводства айчынных гібрыдаў кукурузы мае высокі эканамічны і выразны імпартазамяшчальны эфект (больш за 10 млн долараў у год) за кошт вытворчасці айчыннага гібрыднага насення кукурузы і эканоміі валютных сродкаў на закупку дарагога насення бацькоўскіх форм гібрыдаў кукурузы.



***— А ў цэлым якая патрэба ў насенні кукурузы ў Беларусі?***

— У нашай краіне пры існуючай структуры пасяўных плошчаў патрэба ў насенні кукурузы складае 33 тысячы тон. З іх 52 % у апошнія чатыры гады прыпадалі на айчынныя. Як я ўжо казаў, доля пасеваў кукурузы насеннем айчыннай вытворчасці вырасла з 32 % у 2016 годзе да 60 % — у 2023-м. Увага ўдзяляецца адпрацоўцы асноўных элементаў вырошчвання кукурузы на насенне (бацькоўскія формы, гібрыднае насенне F1). Усе тэхналагічныя аперацыі па вырошчванні беларускіх гібрыдаў кукурузы на насенне ў сыравінных зонах Мазырскага і Івацэвіцкага ККЗ на плошчы 7-8 тыс. га праводзяцца ў адпаведнасці з Галіновым рэгламентам «Апрацоўка кукурузы на насенне». Строгае выкананне ўсіх тэхналагічных працэсаў дасць магчымасць павысіць ураджайнасць насення на ўчастках гібрыдызацыі на 20—30 %, а эканамічны эфект будзе вылічацца сотнямі тысяч долараў за кошт дадатковай вытворчасці насення высокай якасці.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего **УП «УНИДРАГМЕТ БГУ»**
на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

**Электронные торги состоятся 20.11.2024**

**Лот № 1:** Чистая комната-комплект, инв. № 1046. **Лот № 2:** Кондиционер центральный гигиенический для чистых помещений, инв. № 1040. **Лот № 3:** Установка очистки и обезоруживания воздуха БОВ-001-АМС, инв. № 1041. **Лот № 4:** Шкаф вытяжной лабораторный ШВЛ-1, инв. № 1042. **Лот № 5:** Стол-мойка двойная со стеллажом для сушки посуды, инв. № 1043. **Лот № 6:** Рукомойник-тумба. **Лот № 7:** Рукомойник-тумба. **Лот № 8:** Стеллаж для готовой продукции. **Лот № 9:** Стерилизатор ГП40СПУ. **Лот № 10:** Стол для весов. **Лот № 11:** Стол лабораторный 1300*450*900. **Лот № 12:** Стеллаж 1010*510*1850. **Лот № 13:** Стеллаж 1010*510*1850. **Лот № 14:** Стеллаж 1010*410*1850. **Лот № 15:** Стол лабораторный 600*450*900. **Лот № 16:** Стол-мойка низкая, широкая. **Лот № 17:** Стол-подставка 800*500*900. **Лот № 18:** Стол-подставка 900*300*800. **Лот № 19:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 20:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 21:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 22:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 23:** Шкаф для одежды. **Лот № 24:** Шкаф для одежды. **Лот № 25:** Шкаф лабораторный для химических реактивов. **Лот № 26:** Регулятор скорости. **Лот № 27:** Регулятор скорости. **Лот № 28:** Регулятор скорости. **Лот № 29:** Регулятор скорости. **Лот № 30:** Регулятор скорости. **Лот № 31:** Регулятор скорости. **Лот № 32:** Регулятор скорости. **Лот № 33:** Регулятор скорости. **Лот № 34:** Реле электромагнитное. **Лот № 35:** Реле электромагнитное. **Лот № 36:** Реле электромагнитное. **Лот № 37:** Реле электромагнитное. **Лот № 38:** Реле электромагнитное. **Лот № 39:** Реле электромагнитное. **Лот № 40:** Реле электромагнитное. **Лот № 41:** Реле электромагнитное. **Лот № 42:** Щит монтажный ЩМП. **Лот № 43:** Манометр дифференциальный. **Лот № 44:** Манометр дифференциальный. **Лот № 45:** Манометр дифференциальный. **Лот № 46:** Манометр дифференциальный. **Лот № 47:** Устройство А-417А. **Лот № 48:** Устройство А-417А. **Лот № 49:** Устройство А-417А. **Лот № 50:** Устройство А-417А. **Лот № 51:** Устройство А-605. **Лот № 52:** Устройство А-605. **Лот № 53:** Устройство А-605. **Лот № 54:** Устройство А-605. **Лот № 55:** Устройство ADPS-kit. **Лот № 56:** Устройство ADPS-kit. **Лот № 57:** Устройство ADPS-kit. **Лот № 58:** Устройство ADPS-kit.

**Начальная цена с НДС 20 %** Лота № 1 – 27 742,45 руб., Лота № 2 – 32 938,06 руб., Лота № 3 – 8 232,29 руб., Лота № 4 – 1 135,45 руб., Лота № 5 – 1 320,00 руб., Лота № 6 – 132,00 руб., Лота № 7 – 132,00 руб., Лота № 8 – 98,40 руб., Лота № 9 – 876,00 руб., Лота № 10 – 312,00 руб. Лота № 11 – 132,00 руб., Лота № 12 – 111,60 руб., Лота № 13 – 111,60 руб., Лота № 14 – 98,40 руб. Лота № 15 – 103,20 руб., Лота № 16 – 996,00 руб., Лота № 17 – 102,00 руб., Лота № 18 – 75,60 руб., Лотов №№ 19–22 – 600,00 руб. (за один Лот), Лота № 23 – 132,00 руб., Лота № 24 – 132,00 руб., Лота № 25 – 732,00 руб., Лота № 26 – 492,00 руб., Лотов №№ 27–33 – 492,00 руб. за один Лот), Лотов № 34 – 41 – 39,60 руб. (за один Лот), Лота № 42 – 117,60 руб., Лотов №№ 43–46 – 102,00 руб. (за один Лот), Лотов №№ 47–50 – 45,60 руб. (за один Лот), Лотов №№ 51–54 – 156,00 руб. (за один Лот), Лотов №№ 55–58 – 12,00 руб. (за один Лот).

**Местонахождения Лотов №№ 1–58:**
**г. Минск, ул. Академика Курчатова, 1а.**

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• e-mail: torgi@ino.by.**
**Электронный адрес: gostorg.by**

УНП 190055182



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Копыльский районный комбинат бытового обслуживания»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

**комплексно-приемного пункта**
**с инв. № 642/С-23959 общ. пл. 61,4 кв. м**
**(составные части и принадлежности: сарай и пристройка),**
**расположенного на земельном участке**
**с кадастровым номером 622880401101000193,**
**пл. 0,1567 га**
**по адресу: Минская область, Копыльский район, Блевчицкий с/с, аг. Быстрица, ул. Тимирязева, 92.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 10 600,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 1 060,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001 69330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901,** код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов, а также оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **21.11.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.11.2024** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8033) 359-38-00.**

УНП 600076847

# ТРЫ ТЫСЯЧЫ НЕМАЎЛЯТ — ДЗЯКУЮЧЫ ІХ ПРАЦЫ

## У Мінску ўзнагародзілі найлепшых медыкаў, якія займаюцца захаваннем цяжарнасці

**Учора ў сталіцы на базе Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ адбылося падвядзенне вынікаў конкурсу «Святасць нараджэння». Ва ўрачыстай атмасферы заслужаныя ўзнагароды атрымалі яго пераможцы — найлепшыя акушэры-гінеколагі, псіхатэрапеўты і псіхолагі. Мерапрыемства прайшло ў рамках Тыдня бацькоўскай любові.**

Адна з галоўных мэт гэтага маштабнага праекта, які пачынаўся яшчэ ў 2022 годзе, — умацаванне інстытута сям'і і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, у тым ліку шматдзетнасці. Ён накіраваны на павышэнне нараджальнасці, зніжэнне колькасці абортаў і ўдасканаленне медыкаментознай дапамогі цяжарным, а таксама павышэнне эфектыўнасці перадабортнага кансультавання.

Арганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства аховы здароўя, Беларуская праваслаўная царква, Дабрачынны фонд падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства «Пакроў».

Як адзначыў падчас узнагароджання пераможцаў **міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ,** за год удалося захаваць тры тысячы немаўлят у сем'ях, дзе іх не планавалі нараджаць.

— Перадабортным псіхалагічным кансультаваннем і захаваннем цяжарнасці ў жанчын, якія звярнуліся для яе перапынення па жаданні, займаюцца мультыдысцыплінарныя каманды спецыялістаў. Конкурс праводзіцца другі раз. Будзем старацца, каб ён стаў традыцыйным, а тэндэнцыя прафілактыкі абортаў працягвалася. У сістэмы аховы здароўя для гэтага ёсць усё: падтрымка дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы, кадравы патэнцыял, — дадаў міністр.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ВЕНІЯМІН** падкрэсліў, што адзін з прыярытэтаў нашага грамадства і дзяржавы — каб сем'і мацнелі і былі шматдзетнымі.

— Спрадвеку нараджэнне малых — асаблівая падзея для ўсяго роду, блізкіх людзей. На жаль, акцэнты часам змяняюцца. І нараджэнне дзіцяці асацыюецца з цяжкасцямі, клопатамі. Гэта таксама ёсць, але радасць пераважае. Важна, каб спецыялісты, якія працуюць з будучымі маці, дзяліліся сваімі напрацоўкамі з калегамі. Разам успомнім нашы добрыя традыцыі, якія збольшага ў сучасным свеце забываюцца, губляюць сваю вагу, але мы гэтаму супрацьстаім. Таму і праводзім такія конкурсы, каб нагадаць аб галоўнай каштоўнасці, аб'яднаць сілы людзей, якія разумеюць важнасць адраджэння традыцыйнай беларускай сям'і і яе ўмацавання. Менавіта на гэтых прынцыпах трэба выхоўваць маладое пакаленне, — перакананы Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін.

Пераможцаў вызначылі па розных намінацыях. Сярод псіхолагаў Гран-пры атрымала Юлія Лепясевіч з Пінскага міжраённага радзільнага дома, а першае месца ў гэтай жа намінацыі — у Святланы Сіваковай з Магілёўскай паліклінікі № 6. Найлепшы ўрач-псіхатэрапеўт — Алеся Крук з гарадской паліклінікі № 7 Гродна, найлепшы ўрач — акушэр-гінеколаг — Наталля Сушынская з Пінскага міжраённага радзільнага дома, другое месца занявала Ала Варапаева, урач 26-й гарадской паліклінікі Мінска, на трэцім — Юлія Навуменка з Гомельскай цэнтральнай гарадской клінічнай паліклінікі. За найлепшую асветніцкую дзейнасць па захаванні цяжарнасці першае месца атрымала Алена Галаўко, урач — акушэр-гінеколаг, загадчык жаночай кансультацыі 14-й Цэнтральнай раённай паліклінікі Партызанскага раёна Мінска.




Адна з пераможцаў у намінацыі «Найлепшы псіхолаг», псіхолаг Жлобінскай Цэнтральнай раённай бальніцы Марына Дарашкова ўпэўнена, што без дзяцей не можа быць будучыні. У прафесіі Марына Анатолеўна больш за 10 гадоў, у тым ліку больш за сем гадоў займаецца перадабортным кансультаваннем. Праводзіць псіхолаг і сеансы сямейнага перадабортнага кансультавання, на якое будучыя бацькі прыходзяць разам.

— Часам вельмі няпроста знайсці аргументы і патрэбныя словы, бо жанчыны прыходзяць загадзя гатовыя на аборт. Але мне ўдаецца пераканаць, што трэба захаваць цяжарнасць, хоць нярэдка патрэбна і некалькі сустрэч. Затое потым вельмі прыемна, калі жанчыны прыходзяць падзякаваць за тое важнае ў іх жыцці рашэнне, паказваюць фотаздымкі дзіцяці, якое падрастае ў тым ліку і дзякуючы маёй працы, — падзялілася Марына Дарашкова.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЖАМЧУЖЫНЫ КІРАЎШЧЫНЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Напрыклад, тэма «Свечка, асвяці маю душу», — кажа Таццяна. — Як можна запаліць у душы чалавека свечку? Аказваецца, не так складана. Некалькі добрых слоў, усмешка — і чалавек побач запальваецца, перадае святло далей.

— Вось такія людзі, як наша Таццяна, здольныя перадаваць святло іншым, — уключаецца ў размову айцец Дзмітрый. — Гэта нейкая невычарпальная крыніца ідэй. У нас калектыў аднадумцаў. Таму ўсё і атрымліваецца.

Жыццё праваслаўнай абшчыны ў Кіраўскім раёне наогул цікавае. Для дзяцей арганізоўваюцца экскурсіі, гульнявыя заняткі, у летні час адпачынак разам з бацькамі на прыродзе. І ў гэтым задзейнічаны ўсе: райвыканкам, свяшчэннік, прыхаджане.

— Калі калектыў аднадумцаў збіраецца, абавязкова будзе вынік, — перакананы айцец Дзмітрый. — Неабыякавыя людзі з Кіраўска дапамагаюць, штодзень ставяць нейкія задачы, ажыццяўляюць праекты. Кожны чалавек прыносіць сваю ініцыятыву і рэалізоўвае. Добрую справу рабіць нескладана — душа радуецца. У нас існуе праграма ўзаемадзеяння кіраўскага прыхода і райвыканкама. Работа праведзена вялікая. Шмат адбылося мерапрыемстваў, выдадзена сем кніг пра тутэйшыя храмы, гісторыю Кіраўшчыны. Адкрываем імёны, аднаўляем крынічкі. Дзецям цікава пазнаваць свой край. Я ўзначальваю гістарычны аддзел Бабруйскай епархіі, займаюся пасільнымі пошукамі, арганізоўваю экспедыцыі. Сплаўляліся па рэках Свіслачы і Беразіне, прыпыняліся ў спадарожных вёсках, распытвалі людзей і запісвалі іх расповеды пра царкоўныя і гістарычныя падзеі. Даведаліся пра свяшчэнніка Стэфана Кучынскага з мястэчка Свіслач, прозвішча якога знаходзіцца ў Ізраілі на Алеі Праведнікаў: падчас вайны ён ратаваў яўрэйскіх дзяцей.

Айцец Дзмітрый паклапаціўся, каб засталася памяць пра храм Мікалая Цудатворца ў вёсцы Пацава Слабада.



